Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ЛІПЕНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 128
(26241)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Ільготныя крэдыты на будаўніцтва жылля ў Беларусі будуць выдавацца незалежна ад месца жыхарства

Ільготныя крэдыты на будаўніцтва жылля ў Беларусі будуць выдавацца незалежна ад месца жыхарства. Прэзідэнт Беларусі 10 ліпеня падпісаў адпаведны ўказ № 382, якім унесены дапаўненні і змяненні ва ўказ ад 14 красавіка 2000 г. № 185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў».

Дакументам урэгуляваны пытанні, што ўзніклі ў сувязі з уступленнем у сілу ўказа ад 7 верасня 2007 г. № 414 «Аб унясенні змянення і дапаўненняў у некаторыя ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях жыллёвага будаўніцтва» ў частцы прадастаўлення права грамадзянам паляпшаць свае жыллёвыя ўмовы не па месцы іх пастаяннага пражывання.

Указам прадугледжваецца ўключэнне ў спісы на льготнае крэдытаванне грамадзян, што пражываюць у сельскіх населеных пунктах, пасёлках гарадскога тыпу і гарадах раённага падпарадкавання, якія жадаюць пабудаваць (рэканструяваць) або набыць жыллё не па месцы іх пражывання, а ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных межах раёна.

Вызначэнне нарміруемых памераў льготна крэдытуемай плошчы для такіх грамадзян прапануецца ажыццяўляць з улікам агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ва ўласнасці крэдытаатрымальніка і членаў яго сям'і і размешчаных у населеных пунктах па месцы жыхарства і па месцы будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання.

Для ваеннаслужачых, асобаў радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, фінансавых расследаванняў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях пры вызначэнні велічыні льготна крэдытуемай плошчы з улікам жылых памяшканняў, размешчаных не па месцы іх пражывання, будуць прымацца ў разлік толькі тыя жылыя памяшканні, якія былі прадастаўлены Міністэрствам абароны, іншымі дзяржаўнымі органамі, якія маюць воінскія фарміраванні і ваенізаваныя арганізацыі, і якія ў дачэлейшым былі набыты ва ўласнасць ва ўстаноўленым парадку.

Грамадзяне, якія пражываюць у гарадах абласнога падпарадкавання і ў Мінску, могуць уключацца ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў шляхам будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця аднаквартэрных або блакіраваных жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах.

Акрамя таго, у спісы на льготнае крэдытаванне будуць уключацца грамадзяне, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы работы.

Асобным катэгорыям грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а таксама грамадзянам, у складзе сем'яў якіх ёсць дзеці-інваліды, прадастаўлена права на пазачарговае ўключэнне ў спісы на льготнае крэдытаванне. Указам таксама прадугледжана норма аб аднаразовасці права на пазачарговае ўключэнне ў спісы на льготнае крэдытаванне. Так, грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, што рэалізавалі сваё права на пазачарговае ўключэнне ў спісы на льготнае крэдытаванне, не будуць мець права па паўторнае ўключэнне ў гэтыя спісы за выключэннем шматдзетных сем'яў.

У мэтах абароны правоў грамадзян абавязак па выплаце запазычанасці па льготнаму крэдыту і працэнтах за карыстанне ім можа быць ускладзены рашэннем суда на мужа (жонку) крэдытаатрымальніка, іншых членаў сям'і, у тым ліку былых, якія сумесна палепшылі жыллёвыя ўмовы, якія прэтэндуюць на долю ў пабудаванай кватэры, або ў выпадку скасавання шлюбу — на мужа (жонку) крэдытаатрымальніка на падставе шлюбнага або іншага дагавора (пагаднення).

Акрамя таго, дакументам урэгулявана пытанне аб кампенсацыі стратаў ААТ «ААБ «Беларусбанк», звязаных з прадастаўленнем ільготных крэдытаў грамадзянам.

Указ уступае ў сілу з 1 ліпеня 2008 года, за выключэннем некаторых пунктаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Паляпшэнне здароўя людзей — адзін з агульнадзяржаўных прыярытэтаў

Паказчык дзіцячай смяротнасці ў Беларусі не перасягае ўзроўню вядучых еўрапейскіх краін. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі ўчора на адкрыцці Віцебскага гарадскога клінічнага радзільнага дома № 1.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, зніжэнне ўзроўню дзіцячай, у тым ліку і смяротнасці сярод немаўлят, з'яўляецца адным з міжнародных крытэрыяў пазітыўнага развіцця грамадства. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сацыяльна-эканамічны рост, павышэнне ўзроўню жыцця і развіццё аховы здароўя дабратворна адбіліся на здароўі насельніцтва рэспублікі, стала нараджацца больш дзяцей, стабільна зніжаецца мацярынская смяротнасць, а ў Віцебску, напрыклад, за апошнія некалькі гадоў не зафіксавана ніводнага такога выпадку.

Прэзідэнт лічыць, што ў Віцебску склалася вельмі добрая традыцыя — штогод да пачатку фестывалю мастацтваў «Славянскі базар» уводзіць у эксплуатацыю які-небудзь важны сацыяльна-культурны аб'ект. Кіраўнік дзяржавы адзначыў сімвалічнасць таго, што ў Год здароўя віцябчане атрымліваюць абноўлены і аснашчаны па вышэйшаму класу комплекс радзільнага дома. У працэсе рэканструкцыі Віцебскага радзільнага дома № 1, пабудаванага 48 гадоў таму, тут узведзены новы бальнічны корпус, устаноўлена найноўшае абсталяванне, якое дае магчымасць прымяняць сучасныя метады лячэння і догляду маці і нованароджаных. Паводле слоў Прэзідэнта, гэта будзе добрая падмога ў вырашэнні найважнейшых дэмаграфічных задач.

«Не выпадкова ў нашай краіне адным з агульнадзяржаўных прыярытэтаў з'яўляецца павышэнне якасці жыцця і паляпшэнне здароўя людзей. Найважнейшым напрамкам яго рэалізацыі стала дынамічнае развіццё аховы здароўя, уздым на новы ўзровень эфектыўнасці работы і матэрыяльна-тэхнічнай аснашчанасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах Беларусі ствараюцца магутныя медыцынскія цэнтры і сучасныя лячэбныя ўстановы. Апошнім часам шмат зроблена і на Віцебшчыне: завершана рэканструкцыя радзільнага дома ў Оршы, уведзена ў эксплуатацыю акушэрскае аддзяленне Наваполацкай цэнтральнай гарадской бальніцы, пабудавана цэнтральная раённая бальніца ў Гарадку, рэканструявана некалькі лячэбных устаноў у Віцебску.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што на працягу бягучай пяцігодкі павінны быць праведзены ў ідэальны стан усе аб'екты аховы здароўя, ад фельчарска-акушэрскіх пунктаў да бальніц рэспубліканскага ўзроўню. Пры гэтым усе лячэбныя ўстановы краіны будуць аснашчаны сучасным абсталяваннем, адпаведным узроўню гэтых медыцынскіх устаноў. Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на тое, што неабходна адраджаць бальніцы сястрынскага догляду пажылых людзей.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з завяршэннем рэканструкцыі медыцынскіх устаноў у краіне сродкі будуць накіраваны на павышэнне зарплаты ўсім катэгорыям медыцынскіх работнікаў. «Вы хочаце атрымліваць зарплаты, як на Захадзе. Але тады і якасць работы павінна быць, як на Захадзе, і нагрузка на ўрачоў. І тады ў наступнай пяцігодцы мы выведзем зарплаты на ўзровень заходніх урачоў», — сказаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што некаторыя высакакласныя спецыялісты, якія выконваюць асабліва складаныя аперацыі, ужо сёння атрымліваюць добрую зарплату. «Працуйце на такім узроўні — і атрымлівайце добрую зарплату. Мы заўсёды знойдзем на гэта грошы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў той факт, што ўжо сёння ў краіне выконваюцца такія аперацыі, якія раней рабіліся толькі за мяжой і за вялікія грошы. Ён запэўніў урачоў, што дзяржава зробіць усё магчымае, каб яны маглі працаваць у Беларусі і аказваць урачэбную дапамогу грамадзянам на самым высокім узроўні.

Прэзідэнт Беларусі даручыў вырашыць праблему няхваткі ўрачоў у медустановах краіны.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што сітуацыя, калі чалавек не можа трапіць на прыём да спецыяліста або павінен доўга чакаць у чарзе, недапушчальная. Сёння выпускаецца дастаткоўая колькасць маладых спецыялістаў, у медыцынскіх установах пры гэтым не хапае ўрачоў. А навучанне і падрыхтоўка будучага ўрача — гэта вельмі вялікія затраты. Таму неабходна прымаць рашэнне «па тых быццам бы ўрачах, якіх 6 гадоў вучылі за кошт дзяржавы, а яны сёння займаюцца іншай дзейнасцю». Як лічыць Прэзідэнт, такіх урачоў, што на працягу двух гадоў працуюць не па спецыяльнасці, неабходна пазбаўляць магчымасці займацца медыцынскай дзейнасцю без перанавучання. «Ва ўрача ў руках вельмі дарагое — здароўе і жыццё людзей, і жартаваць з гэтым нельга», — падкрэсліў Прэзідэнт, дадаўшы, што ў гэтым напрамку будуць прымацца сур'ёзныя меры.

У якасці вырашэння праблемы няхваткі ўрачоў было прапанавана ўвесці мэтавае накіраванне для навучання ў медыцынскіх ВНУ. Як заявіў Прэзідэнт, той, хто вучыцца па мэтавым накіраванні, пасля заканчэння ВНУ ў абавязковым парадку павінен выйсці на работу ў тым населеным пункце, які яго накіраваў.

Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што з даўніх часоў урач, як і настаўнік, з'яўляецца цэнтральнай фігурай, і дзяржава будзе заўсёды сур'ёзна ставіцца да гэтых катэгорый і клапаціцца пра іх.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што будаўніцтва жылля ў вёсцы для спецыялістаў неабходна аптымізаваць.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што частка пабудаваных у аграгарадках дамоў да гэтага часу застаецца незаселеная. У маштабах краіны іх не так многа, адна вырашаць гэту праблему неабходна. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сацыяльная і вытворчая сферы павінны развівацца паралельна, а таму частку сродкаў, выдзеленых на будаўніцтва індывідуальных дамоў у вёсцы, неабходна перанакіраваць на іншыя патрэбы.

Праводзячы рабочую паездку ў Віцебскую вобласць, кіраўнік дзяржавы з борта верталёта азнаёміўся з ходам сельскагаспадарчых работ на Міншчыне і Віцебшчыне, станам палёў.

БЕЛТА.

НА «БАЗАР», НА СВЯТА!

Дзённік фестывалю

ВІЦЕБСК НЕ СПІЦЬ

Ва ўсякім выпадку, такое адчуванне ўзнікае, калі глядзець на афішу мерапрыемстваў XVII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». А сёлета гэтых мерапрыемстваў — больш як 80 на 10 пляцоўках. Насельніцтва горада на Дзвіне прырасло ў фестывальныя дні прыкладна на 5,5 тысячы чалавек — гасцей і ўдзельнікаў фестывалю з 34 краін свет (з усіх кантынентаў!).

Агульнаму святочнаму настрою, здаецца, паддалося нават надвор'е — замест звыклых ужо дажджоў Віцебску дасталося ліпеньскае сонейка. Да начных канцэртаў, праўда, усё адно халадае — але вопытныя, загартаваныя заўсёднікі канцэртаў загадзя ўцяпляюцца і без асаблівых цяжкасцяў даседжваюць у амфітэатры амаль да раніцы. Прынамсі першы фестывальны дзень фінішаваў з канцэртам «ЕўраФэст прадстаўляе: Зоркі «Еўрабачання» толькі а 4-й гадзіне. Пераможцу «Еўрабачання-2008» Дзіму Білана дзявочы фанклуб літаральна засыпаў кветкамі, узнагародзіўшы сябе за доўгае чаканне аўтограф-сесіяй і магчымасцю дакрануцца да куміра. Мужчынскую частку аўдыторыі больш уразілі, зразумела, прыгажуні-спявачкі Сірушо, Наталля Падольская, Ані Лорак. А «Марскім піратам» з Латвіі апладзіравалі ўсе — нездарма ж прыбалтыйскія госці так стараліся, напярэдадні развучыўшы народны хіт «Ты ж мяне падманула». Не менш гарачы прыём чакаў «йеменскага салаўя з Ізраіля» Боаза — адкуль у хударлявым хлопцу такая галасіна бярэцца, звычайнаму гледачу незразумела, але вельмі, вельмі прыемна...

(Заканчэнне на 2-й стар.)

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА ВЫХАДНЫЯ ІСТОТНА ПРЫПЯЧЭ, МЕСЦАМІ ДА ПЛЮС 33

У суботу з поўдня Еўропы на тэрыторыю Беларусі пачынае паступаць спякотнае паветра Міжземнамор'я, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

У выхадныя будзе горача, толькі паўночна-заходнія раёны краіны застануцца пад уплывам вільготнага паветра з боку Балтыкі. Таму ў суботу месцамі ў Гродзенскай, Віцебскай і па паўночным захадзе Мінскай абласцей чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра 23—29, па паўднёвым захадзе да 32 градусаў. У нядзелю невялікія дажджы і навальніцы магчымыя месцамі па паўночным захадзе краіны. Тэмпература ўначы 14—20, удзень 27—33 градусы цяпла. У панядзелак кароткачасовыя дажджы чакаюцца ў заходнім рэгіёне. Тэмпература ўначы 15—21, удзень 23—33 градусы, толькі па паўночным захадзе ўдзень — 24—26 цяпла. З аўторка да нас пачне паступаць крыху халаднейшае паветра з заходняй часткі Еўропы. Тэмпература паветра ўдзень захаваецца на ўзроўні 23—28 цяпла. Моцных дажджоў не прадбачыцца.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Сяргей КУРКАЧ.

ПАДАРАЖЭЛА ГАРЭЛКА

З учарашняга дня на 4 працэнты ўзраслі рознічныя цэны на гарэлку і на 10 працэнтаў — адпускныя цэны на спірт этылавы харчовы.

Паводле інфармацыі Міністэрства эканомікі, рознічная цана на гарэлку «Крышталь Класічная», «Клюковая», «Белая Русь сярэбраная» складзе 6 тысяч 170 рублёў за бутэльку 0,5 літра без кошту посуду. Апошняе рашэнне прынята па прапанове канцэрнаў «Белхарчпрам» і «Белбіяфарм» для кампенсацыі росту акцыза і падаражання кошту зерня. У міністэрстве нагадалі, што рознічныя цэны на гарэлку не змяняліся з леташняга жніўня.

Ігар ГРЫШЫН.

МІЖГАРОДНІЯ ПАЕЗДКІ — ПА НОВЫХ ТАРЫФАХ

З 10 ліпеня ў сярэдним на 20 працэнтаў павышаны гранічны максімальны ўзровень тарыфаў за адзін кіламетр праезду пасажыраў і правоз багажу аўтобусамі міжгародніх зносінаў на звычайных, хуткасных, экспрэсных і дадатковых рэгулярных маршрутах, паведамілі ў Мінэканомікі.

Гранічныя максімальныя тарыфы на перавозкі пасажыраў аўтобусамі агульнага тыпу на звычайных рэгулярных маршрутах міжгародніх зносінаў складаюць 96 рублёў за 1 кіламетр праезду, у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — 100, на хуткасных маршрутах адпаведна — 124,8 і 130 рублёў, на экспрэсных — 144 і 150, на дадатковых рэйсах — 129,6 і 135 рублёў. Як адзначаюць у міністэрстве, гэтыя тарыфы не пераглядаліся з лістапада 2006 года. А рашэнне аб іх павышэнні прынята ў сувязі са стратнасцю, якая абумоўлена ростам затрат, — павышэнне цэнаў на бензін, дызпаліва, запасныя часткі, іншыя матэрыялы і паслугі іншых арганізацый. Дарэчы, пасажыраперавозчыкі маюць права, зыходзячы з попыту і прапановы, прымяняць і больш нізкія тарыфы, чым тыя, што ўстаноўлены пастановай.

Ігар ГРЫШЫН.

ПЕНСІЯ Ў ЗВЯЗЦЫ... З СУКУПНЫМ ДАХОДАМ?

На слыху

Ці праўда, што працуючыя пенсіянеры будуць атрымліваць толькі палову сваёй пенсіі? Варта заўважыць, што зараз такое пытанне даводзіцца чуць усё часцей. Аднак таксама не сакрэт: размовы аб увядзенні новых абмежаванняў па пенсійных выплатах усім тым, хто не пакідае работу, час ад часу з'яўляюцца на працягу вось ужо некалькіх гадоў запар. І ўсё ж ці маюць такія размовы падставы і чаго чакаць працуючым пенсіянерам у будучыні? Такім чынам, па каментарый мы вырашылі звярнуцца да начальніка аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны Аляксандраўны ПАГОНЫШАВАЙ.

— Для пачатку давайце ўдакладнім: колькі пенсіянераў працуе ў Беларусі цяпер?

— Як паказвае статыстыка, у Беларусі пасля прызначэння пенсіі працягвае працаваць 551,3 тыс. чалавек, і ў тым ліку 199,5 тыс. мужчын і 351,8 тыс. жанчын. У прыватнасці, пасля выхаду на пенсію не пакінулі работу 36,4 тыс. мужчын і 60,2 тыс. жанчын ва ўзросце да 55 гадоў (разумела, што гаворка тут ідзе аб пенсіянерах-датэрміноўшчыках); 35,4 тыс. мужчын (зноў-такі датэрміноўшчыкаў) і 163,7 тыс. жанчын ва ўзросце 55—59 гадоў; 65 тыс. мужчын і 64,5 тыс. жанчын ва ўзросце 60—64 гады, 36,8 тыс. мужчын і 41,6 тыс. жанчын ва ўзросце 65—69 гадоў.

Сярод тых, каму прызначылі пенсію сёлета, засталіся працаваць 75 працэнтаў жанчын і амаль 70 працэнтаў мужчын. Прычым доля працуючых грамадзян у агульнай колькасці пенсіянераў працягвае пакрысе ўзрастаць — сёння гэта доля складае 22,5 працэнта.

— Прычына — у нізкіх памерах пенсій?

— Гэта чамусьці сапраўды ўзгадваецца ў першую чаргу. Аднак адначасова ўсе забываюцца на іншае: на памерах пенсій адбіваюцца якраз выплаты працуючым. На фінансаванне пенсій тым, хто працягвае працаваць, накіроўваецца больш за 20 працэнтаў пенсійных сродкаў. Інакш кажучы, гэтыя сродкі на справе аднімаюцца ад тых, для каго пенсія з'яўляецца адзінай крыніцай даходаў, і стрымлівае павелічэнне памераў выплат грамадзянам, якія з-за ўзросту ці стану здароўя працаваць ужо не могуць.

— Сёння ў заканадаўстве ёсць норма: у працуючых пенсіянераў выкарыстоўваецца індывідуальны каэфіцыент заробку да 1,3, тады як у пенсіянераў непрацуючых — часткова і каэфіцыент ад 1,3 да 4,0. Словам, абмежавальнік існуе. Ён дастатковы?

— На наш погляд, падобная норма патрабуе пэўнай карэкціроўкі. Па сутнасці цяпер абмежаванне пенсій «па каэфіцыенце» працуючым пенсіянерам звязанае з іх мінулымі даходамі. Аднак частка мінулыя даходы не супадаюць з бягучымі — скажам, цалкам верагодна, што некалі высокадаходны работнік сёння ўладкаваўся на нізкаплатную работу або займаецца падпрацоўкай. Таму больш правільным быў бы іншы падыход — выплата пенсіі ў залежнасці ад сукупнага (пенсія плюс зарплата) бягучага даходу. Тым больш, што магчымасці адсочваць цяперашні сукупны даход працуючага пенсіянера ёсць. У прыватнасці, для гэтага існуюць даныя індывідуальнага персаніфікаванага ўліку сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Прычым такімі звесткамі раённыя ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне карыстаюцца ўжо цяпер, таму забывацца інфармаваць гэтыя службы аб сваім працаўладкаванні пенсіянеру ні ў якім разе нельга.

Дарэчы, нормы па абмежаванні выплат пенсій у залежнасці ад цяперашняга сукупнага даходу шырока выкарыстоўваюцца ў Германіі, Канадзе і іншых развітых краінах свету. Была падобная практыка і ў нас — у час існавання СССР. Нягледзячы на адсутнасць беспрацоўя і недахоп працоўнай сілы пенсія разам з заробкам у месяц не магла перавышаць агульную суму ў 150 рублёў, а для рабочых і малодшага абслугоўвага персаналу паталок быў вызначаны ў 300 рублёў. Як вынік, з улікам сярэдняй зарплаты ў 1990 годзе ў 269 і сярэдняй пенсіі ў 110 рублёў часта атрымлівалася, што памер пенсіі таго ж працуючага пенсіянера-рабочага складаў 31 рубель. Як бачна, абмежаванні былі больш жорсткімі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Цяперашняе абмежаванне пенсій «па каэфіцыенце» працуючым пенсіянерам звязанае з іх мінулымі даходамі. Аднак у будучыні падыход можа змяніцца — выплата пенсій стане рабіцца з улікам сукупнага (пенсія плюс зарплата) цяперашняга даходу.

КЕЙС ПАРАЛІЗАВАЎ РУХ У МЕТРО

У Мінску эвакуявалі пасажыраў са станцыі метрапалітэна. Інцыдэнт адбыўся каля паловы адзінаццатай вечара ў чацвер на першай лініі станцыі метро «Уручча»: тут дзяжурны міліцыянер знайшоў на платформе безгаспадарны чорны дыпламат.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, сярод пасажыраў, да якіх звярнуўся пільны праваахоўнік, гаспадара кейса не было. А таму міліцыянер, які дзейнічаў па інструкцыі, хутка перадаў інфармацыю аб знаходцы ў дзяжурную часць і дзяжурнай па станцыі. Пасажыраў, якія знаходзіліся на платформе эвакуявалі. Зразумела, рух цягнікоў на станцыях метро «Уручча», «Барысаўскі тракт» і «Ўсход» быў спынены. А да ачэпленага месца здарэння прыбылі супрацоўнікі падраздзялення размініравання, якія накрылі падазроны дыпламат супрацьвыбуховым прыстасаваннем «Фантан ЗМ». Якраз пасля гэтага праваахоўнікам паступіла інфармацыя, што знайшоўся рассеяны гаспадар дыпламата: ён апісаў свой кейс, забыты на станцыі, які быў поўнасцю ідэнтычны знойдзенаму. Як высветлілася пасля, калі дыпламат быў адкрыты, у ім сапраўды знаходзіліся асабістыя рэчы разявакі. Пасля гэтага метро зноў запрацавала. У выніку няўважлівасці, якую дазволіў сабе адзін пасажыр, рух цягнікоў у метро быў спынены на паўгадзіны, што, між іншым, прынесла шмат нязручнасцяў многім людзям.

Ігар ГРЫШЫН.

Дэпартамент па ядзернай энергетыцы будзе створаны ў Мінэнерга Беларусі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 378 аб стварэнні Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Міністэрства энергетыкі.

Дэпартамент будзе ўтвораны ў мэтах выканання задач па фарміраванні і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне ядзернай энергетыкі.

Аліна ГРЫШКЕВІЧ, БЕЛТА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Борисовском райисполкоме

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства гаража № 60 (пл. 25 кв.м) с подвалом (пл. 10 кв.м) в ГК «Днепровец» в г. Борисове. Начальная цена 10 274 000 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 12.08.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в Интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Минском райисполкоме

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства незавершенного строительством блокированного жилого дома (общ. пл. 3 712,56 кв.м) и земельных участков пл. 0,1546 и 0,1656 га в д. Копище Минского р-на. Начальная цена снижена на 10 % и составляет 6 691 246 200 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.05.2008 г. **Аукцион состоится 29.07.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28.07.2008 г. до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8017) 2246134. Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ААН АДМОВІЛА ЎКРАІНЕ Ў РАЗГЛЯДЗЕ ПЫТАННЯ АБ ГАЛАДАМОРЫ

Генеральны камітэт Генасамблеі ААН не ўключыць у парадак дня 62-й сесіі пытанне аб галаданоры ва Украіне ў трыццатых гадах мінулага стагоддзя.

На разгляд гэтай тэмы настойваў Кіеў. Нагадаем, 3 ліпеня ПА АБСЕ прыняла рэзалюцыю па Абхазіі і галаданоры ва Украіне, генацыдам ён так і не быў прызнаны.

ПАЎДНЁВАЯ КАРЭЯ ПРЫПЫНІЛА ТУРЫ Ў КНДР З-ЗА ЗАБОЙСТВА ТУРЫСТКІ

Сеул прыпыніў паездкі турыстаў у КНДР пасля таго, як паўночнакарэйскія салдаты ў пятніцу застрэлілі паўднёвакарэйскую грамадзянку.

Як паведамлялася раней, 53-гадовая Пак Ван Чжа была забітая пасля таго, як падчас прагулкі зайшла на закрытую тэрыторыю ваеннага аб'екта.

ГРУЗІЯ АДКЛІКАЛА ПАСЛА З РАСІІ

Улады Грузіі прынялі рашэнне аб адкліканні пасла з Расіі з-за падзей у зонах рэгіянальных канфліктаў у Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Гэта адбылося пасля таго, як афіцыйны Тбілісі ўручыў прадстаўніку Расіі ноту пратэсту з нагоды пралёту самалётаў ВПС РФ над Паўднёвай Асеціяй.

Расійскае знешнепалітычнае ведамства прызнала факт палётаў расійскіх ваенных самалётаў над непрызнанай рэспублікай. Пры гэтым у расійскім МЗС падкрэслілі, што гэта было зроблена, каб не дапусціць «развіцця сітуацыі па сілавым сцэнары».

ДЖОРДЖ БУШ ПАДПІСАЎ ЗАКОН АБ ПРАСЛУХОЎВАННІ ТЭЛЕФОНАЎ



Прэзідэнт ЗША Джордж Буш падпісаў у чацвер закон аб праслухоўванні тэлефонных размоў.

Новы закон пашырае магчымасці амерыканскіх спецслужбаў, а таксама гарантуе судовы імунітэт тэлекамунікацыйным кампаніям, якія давалі ўладам магчымасць праслухоўвання гутарак сваіх кліентаў у рамках антытэрарыстычнай кампаніі пасля 11 верасня 2001 года. Менавіта гэты пункт выклікаў найбольшыя спрэчкі падчас абмеркавання законапраекта ў Палаце прадстаўнікоў і Сенаце ЗША.

МАКЕЙН ПААБЯЦАЎ СВАЙГО САВЕТНІКА АДПРАВІЦЬ ПАСЛОМ У БЕЛАРУСЬ

Кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Рэспубліканскай партыі Джон Макейн паабяцаў адправіць свайго саветніка па эканамічных пытаннях Філа Грэма паслом у Беларусь, паведамляецца на сайце CNN. Падставай для гэтага сталі рэзкія выказванні апошняга ў інтэрв'ю выданню The Washington Times.

Калі журналісты спыталі Макейна, ці зойме Грэм у выпадку перамогі рэспубліканца на выбарах якую-небудзь пасаду ў прэзідэнцкай адміністрацыі, сенатар адказаў: «Я сур'ёзна разглядаю яго кандыдатуру на пасаду пасла ў Мінску. Праўда, не ўпэўнены, што жыхарам Беларусі гэта спадабаецца». У выказванні эканамічнага інтэрв'ю Філ Грэм заявіў, што амерыканцы сталі «нацыяй ныцікаў», а краіна перажывае «ментальную рэцэсію». Грамадства ўспрынята яго каментарыі як абразлівыя.

ЛІТВЕ ПРАПАНАВАЛІ ПРАДАЦЬ АДЗІНЫ НАФТАПЕРАПРАЦОЎЧЫ ЗАВОД

Польскі канцэрн PKN Orlen звярнуўся да прэм'ер-міністра Літвы Гедыміна Кіркласа з прапановай аб куплі 10 працэнтаў акцый Mazeikiu nafta, якія належаць дзяржаве. Магчымая сума здзелкі складае 174 мільёны еўра.

PKN Orlen валодае 84,3 працэнтамі акцый Mazeikiu nafta, астатнія — у дробных акцыянераў. Урад Літвы не выключае магчымасці продажу свайго пакета, аднак для гэтага неабходны дазвол парламента рэспублікі.

БАНК РАСІІ ПАВЫСІЎ СТАЎКУ РЭФІНАНСАВАННЯ Ў ЧАЦВЁРТЫ РАЗ З ПАЧАТКУ ГОДА

Савет дырэктараў Банка Расіі вырашыў павысіць узровень стаўкі рэфінансавання да 11 працэнтаў гадавых з 14 ліпеня 2008 года.

Павышэнне стаўкі ЦБ РФ выкарыстае ў якасці інструмента для рэгулявання інфляцыі, якая з пачатку года перавысіла 9 працэнтаў гадавых. У Цэнтрабанку заяўляюць, што па выніках года гэты паказчык не перавысіць 12 працэнтаў.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.07.2008 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
1 долар ЗША	2 121,00	Цэнтрабанк РФ	
1 еўра	3 345,56	USD	23,3727
1 латвійскі лат	4 761,48	10 UAH	50,5903
1 літоўскі літ	968,96	1000 BYR	11,0210
1 чэшская крона	142,43	EUR	36,8774
1 польскі злоты	1022,29	Курс у гандлёвых кампаніях (на 11.07.2008 г.)	
1 расійскі рубель	90,75	USD	2135 / 2210
1 украінская грыўня	458,72		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

Удасканалены парадак праходжання ваеннай службы ў Беларусі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 380 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні парадку праходжання ваеннай службы і службы ў ваенізаваных арганізацыях».

Дакумент прыняты ў мэтах аптымізацыі колькасці пасад са штатна-службовай катэгорыяй «палкоўнік» і ёй роўнай у сілавых ведамствах, назначэння афіцэраў на гэтыя пасады зыходзячы з маштабу, адказнасці і аб'ёму задач, што вырашаюцца пры выкананні службовых абавязкаў. Гэтым указам устанаўліваецца гранічная колькасць пасад са штатна-службовай катэгорыяй «палкоўнік» і ёй роўнай у дзяржаўных органах сістэмы забеспячэння бяспекі, а таксама ўносяцца дапаўненні ў шэраг указаў Прэзідэнта. Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2009 года, за выключэннем асобных пунктаў, што ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў...

Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў ордэнам Францыска Скарыны генеральнага дырэктара — мастацкага кіраўніка дзяржаўнай навукова-творчай установы Краснадарскага краю «Кубанскі казацкі хор» Віктара Захарчанку і старшыню Усерасійскай творчай арганізацыі «Саюз мастакоў Расіі» Валянціна Сідарава. Яны ўдастоены гэтай узнагароды за значны асабісты ўклад у развіццё культурных сувязяў паміж Беларуссю і Расіяй.

* * *

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў указ № 370 аб узнагароджанні дзяржаўнымі ўзнагародамі. Ордэна Францыска Скарыны ўдастоены наменік дырэктара па выхаваўчым навучанні Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Уладзімір Сяргейчык, медаля «За працоўныя заслугі» — загадчык трупы Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» Валянцін Гехт, медаля Францыска Скарыны — саліст оперы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы Уладзімір Громаў і іншыя. У адпаведнасці з распараджэннем нумар 192рп Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена групе будаўнікоў за шматгадовую плённую працу і асабісты ўклад ва ўзвядзенне лядовай арэны ў Пружанах.

* * *

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 371 «Аб узнагароджанні медалём «За бездакорную службу» I, II, III ступеняў». Узнагарод удастоены 240 ваеннаслужачых і супрацоўнікаў МНС.

...аб'явіў падзяку

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь аб'явіў Падзяку групе выпускнікоў ваенных навучальных устаноў. У прыватнасці, гэтай узнагароды за поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне службовага абавязку ўдастоены выпускнік факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сілаў Ваенная акадэміі Беларусі палкоўнік Дзмітрый Кавалёў, выпускнік Ваеннай акадэміі Генеральнага штаба Узброеных Сілаў Расіі палкоўнік Вадзім Дзенісенка, выпускнік Ваеннай акадэміі сувязі імя С.М. Будзённага маёр Максім Байдакоў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Вызначаны парадак перадачы ваеннаслужачымі іх акцый

Вызначаны парадак перадачы ваеннаслужачымі, асобамі радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю прыналежных ім долей удзелу (акцый, правоў) у статутных фондах камерцыйных арганізацый у давернае кіраванне на час праходжання ваеннай службы (службы) ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, іншых войсках і воінскіх фарміраваннях краіны, органах унутраных спраў, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях і органах фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Гэты парадак вызначаны ў адпаведнасці з падпісаным кіраўніком дзяржавы Указам № 384 «Аб унясенні змяненняў ва Ўказ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 сакавіка 2004 г. № 136».

Названыя службовыя асобы павінны будуць перадаваць у давернае кіраванне прыналежныя ім долі ўдзелу (акцыі, правы) у статутных фондах камерцыйных арганізацый у парадку, устаноўленым для дзяржаўных служачых. Прыняцце Ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь накіравана на прадухіленне ўзнікнення ўмоў для карупцыі, выключэнне магчымасці ўплыву службовымі асобамі, якія маюць долі ўдзелу (акцыі, правы) у статутных фондах камерцыйных арганізацый, на дзейнасць такіх юрыдычных асобаў у сваіх інтарэсах і з выкарыстаннем службовага становішча. Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПЕНСІЯ Ў ЗВЯЗЦЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Адразу ж напрошваецца пытанне: як можна вызначыць падобны паталок цяпер?

— Пакуль адназначнага адказу на гэта пытанне няма. Прынамсі, пакуль тут ёсць некалькі прапаноў. Па-першае, вызначыць «планку» сукупнага даходу ў залежнасці ад заробку чалавека перад выхадам на пенсію. Ці, па-другое, найбольшай велічынёй можа стаць пэўная колькасць бюджэтаў пражыткавага мінімуму пенсіянера. Словам, варыянты ёсць, і канкрэтныя прапановы будуць рыхтавацца ў рамках работы над новым заканадаўствам аб увядзенні ў пенсійную сістэму ўмоўна-накапляльных рахункаў.

Пры гэтым пенсія будзе вылічвацца выходзячы з аб'ёмаў узносаў, выплачаных работнікам на пенсійнае страхаванне. Дарэчы, закончыць работу над гэтым законапраектам плануецца да канца 2009 года.

— Тым часам не сакрэт, што цяпер многія пенсіянеры займаюць працоўныя месцы, не прывабныя для моладзі — скажам, працуюць ліфцёрамі, вахцёрамі, гардэробшчыкамі, прыбіральшчыкамі. Ці не прывядзе новаўвядзенне да таго, што ахвотнікаў працаваць на гэтых пасадах проста не будзе?

— Гэта сітуацыя вядомая, таму новыя падыходы будуць распаўсюджвацца з улікам таго, каб вывесці з-пад абмежаванняў пенсіі тых, хто займаецца работай з невысокай аплатай.

— Давайце ўдакладнім яшчэ раз: прапановы выплачваць пенсіі працуючым пенсіянерам у памеры 50 працэнтаў не будзе?

— Менавіта такі варыянт не разглядаецца. Бо спроба вырашыць сітуацыю такім чынам прывядзе да іншых праблем. Пагадзіцеся, што прынцыпова няправільна падыходзіць з аднолькавым абмежаваннем да пенсій у 200 і ў 500 тысяч рублёў.

— Яшчэ адна няпростая тэма. Як вядома, сёння работа пасля прызначэння пенсіі на яе памер ужо не ўплывае. Аднак пры гэтым працуючы пенсіянер працягвае рабіць узносы на пенсійнае страхаванне. Чаму?

— Пенсіянер, які застаецца на рынку працы, мае ўсе як правы, так і абавязкі работніка — і ў тым ліку абавязкі па выплаце падатковага падатку і ўзносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

Пры гэтым карэкціроўка салідарных абавязкаў работніка па падтрымцы бюджэту і сацыяльнага фонду здаецца непрымальнай, бо ад гэтых абавязкаў залежаць як сацыяльныя выдаткі на ахову здароўя, адукацыю, інфраструктуру населеных пунктаў і г.д., так і памеры пенсій. Менавіта гэтым і тлумачацца цяперашнія нормы. Разам з тым прапановы вызваліць працуючых пенсіянераў (але не іх работадаўцаў) ад выплаты пенсійных узносаў ёсць. Магчымасць рэалізацыі такіх прапаноў будзе вывучацца разам з іншымі рацыянальнымі падыходамі — перш-наперш павышэннем пенсійнага ўзросту і істотным абмежаваннем пенсій пры высокіх бягучых заробках.

— Між тым, ці захаваецца ў будучыні норма, паводле якой ёсць магчымасць павялічваць памер пенсіі на 1 працэнт ад заробку — за кожныя два месяцы работы пры добраахвотнай адмове ад атрымання пенсійных выплат?

— Больш позні зварот па пенсію прэміявань пенсійная сістэма проста абавязана. Таму такі падыход застанецца, і больш за тое, не выключана, што ў такім выпадку будзе прапаноўвацца больш адчувальная дабаўка да пенсіі.

Сяргей ГРЫБ.

Спорт-тайм

БАТЭ ПАКРЫЎДЗІЎ БЫЛОГА ТРЭНЕРА

У матчы 14-га тура чэмпіянату Беларусі футбалісты барысаўскага БАТЭ з сухім лікам выйгралі ў падначаленых свайго былога наставніка Ігара Крыушэнкі — 2:0. Трэнер не змог стрымаць эмоцый, за што быў выдалены і дагледжваў паядынак ля ўваходу ў падтрыбунныя памяшканні. Пасля гэтага поспеху дзеючыя чэмпіёны краіны апярэджваюць свайго канкурэнта, сталічнага МТЗ-РІПА, на 8 ачкоў (БАТЭ мае 34 ачкі). Сёння трактаразаводцы могуць скарачыць сваё адставанне, бо выйдуць на поле супраць аднаго з аўтсайдараў вышэйшай лігі, мінскага «Лакаматыва».

МАЛАДАЯ МАЦІ ЕДЗЕ Ў ПЕКІН

Чэмпіянат краіны па лёгкай атлетыцы ў Гродне дапамог сфарміраваць склад беларускай дэлегацыі на Алімпіяду-2008 у кідальных дысцыплінах. Адна з прыемных навінаў, што ў Пекін адправіцца штурхальніца ядра і маладая маці Наталля Міхневіч (да шлюбу Харанека). Акрамя яе ў спаборніцтвах жанчын таксама выступяць Надзея Астапчук і Юлія Леанцюк, а сярод мужчын — муж Наталлі Андрэй Міхневіч і яго калегі па амплуа Павел Лыжын і Юрый Бялоў. У кіданні молата выступяць Аксана Мянькова, Дар'я Пчэльнік, Іван Ціхан, Вадзім Дзевятоўскі, Валерый Святоха. У кіданні дыска на Гульнях будуць спаборнічаць Ірына Ятчанка, Ганна Мазгунова, Эліна Зверава, Дзмітрый Сівакоў. Канчатковы алімпійскі спіс прадстаўнікоў каралевы спорту будзе сфарміраваны пасля турніру імя Міхаіла Жалабоўскага, які пройдзе 19 ліпеня ў «Стайках».

ВІЦЕБСК НЕ СПІЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але гэта ўсё ж была толькі размінка. Учора, 11 ліпеня, адбылося афіцыйнае ўрачыстае адкрыццё «Славянскага базару-2008». Па традыцыі, на канцэрце адкрыцця прысутнічаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Менавіта з яго рук атрымалі прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва сёлетнія лаўрэаты — народны артыст Расіі рэжысёр Сяргей Арцыбашаў, знакаміты акцёр, народны артыст Беларусі Уладзімір Гасцюхін, і народны артыст Беларусі, дырыжор і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаіл Фінберг. (Нагадаем, прэміі Саюзнай дзяржавы ўручаюцца сёлета ў чацвёрты раз.) Таксама па традыцыі была ўручана спецыяльная прэмія «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення», прысуджаная ў гэтым годзе народнай артыстцы СССР, кампазітару Аляксандры Пахмутавай.

Што датычыцца непасрэдна канцэртнай праграмы адкрыцця, напэўна, не мае сэнсу пералічваць дзесяткі яе ўдзельнікаў: канцэрт трансляваўся ў прамым эфіры. Як заўважыў міністр культуры Беларусі Уладзімір Мацвяйчук, галоўная праблема на фестывалі толькі адна — ён не можа ўмясціць у праграму ўсіх ахвотнікаў выступіць. А такіх з кожным годам робіцца ўсё больш. Не змянілі сітуацыі нават перасцярогі, звязаныя з павышанымі мерамі бяспекі. Яны вельмі сур'ёзныя — па дарозе да амфітэатра трэба прахадзіць як мінімум чатыры міліцэйскія кардоны з аглядамі, там-сям на дарозе заўважныя машыны службы размяшчавання, а пасля 16 гадзін у радыусе кіламетра ад фестывальных пляцовак не прадаецца ніякага алкаголю, уключаючы піва. Але разам з тым клопат пра бяспеку вельмі тактоўны і не напружвае ні гасцей, ні гледачоў: працэс стопрацэнтнага запаўнення амфітэатра падоўжыўся ўсяго на 20—30 хвілін. І гэта, безумоўна, у плюс арганізатарам.

Аднак не толькі павышанай бяспекай характарызуецца «Славянскі базар-2008». Напрыклад, сёлета ўпершыню — і, як сцвярджаюць у дырэкцыі фестывалю, магчыма назаўжды — змяніў сваю «прапіску» любімы гасцямі фестывальнага Віцебска «Горад майстроў». Часовы вытворча-гандлёвы комплекс ганчароў, кавалёў, ткачоў і іншых «залатых рук» майстроў цяпер знаходзіцца на «Саляных складах» — гэта помнік архітэктуры XVIII стагоддзя, добра бачны з Кіраўскага моста над Заходняй Дзвіной. Дарэчы, у Горадзе майстроў сёлета віруе сваё насычанае жыццё: хутка тут пройдзе конкурс вышывальшчыц і майстрых карункаў, традыцыйных майстар-класы кавалёў і ганчароў.

Але асноўную ўвагу на фестывалі, як заўжды, прыцягваюць музычныя конкурсы — міжнародны конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні і міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск-2008». Сёння ў юных канкурсантаў, сярод якіх і нашы Раман Валазнёў і Аліна Молаш, — адказны першы дзень творчага спаборніцтва. За Віталя Гардзея, які прадставіць Беларусь у конкурсе выканаўцаў эстраднай песні, пакуль што можна не хвалявацца. Сёння пройдзе толькі адборачны паўфінал. А Віталь, гэтаксама як расіянка Лена Валеўская і ўкраінец Уладзіслаў, выступіць адразу ў фінале. Як паабяцаў старшыня журы маладзёжнага конкурсу, французскі кампазітар і колішні спявак Рыкарда Качыянтэ (менавіта ён напісаў музыку да славутага мюзікла «Нотр-Дам дэ Пары»), судзіць ён будзе не столькі вакал, колькі ўменне канкурсантаў раскрыць голасам прыгажосць сваёй душы. «Голас — гэта ўнікальны і найлепшы інструмент, варта толькі ўмець ім карыстацца», — пераканаў маэстра. А яму варта верыць хоць бы з той прычыны, што сінъёр — ці правільней усё ж месье? — Качыянтэ ў свой час узяў галоўны прыз на песенным фестывалі ў Сан-Рэма. Ці дапаможа ягоная парада ўдзельнікам? Не ведаю. Убачым у нядзелю і панядзелак, па выніках абодвух конкурсных дзён.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК, *Віцебск.*

Леанід Козік спадзяецца на паспяховае выступленне беларускіх гімнастак у Пекіне

Старшыня ФПБ Леанід Козік спадзяецца на тое, што беларускія гімнастыкі паспяхова выступяць на маючай адбыцца летняй Алімпіядзе. Аб гэтым ён сказаў у Мінску на цырымоніі вяшавання спартсменак, якія заваявалі некалькі медалёў чэмпіянату Еўропы па лёгкай атлетыцы.

«Лічу, што з Пекіна вы таксама прывезяце медалі», — сказаў старшыня ФПБ. Чатыры выхаванкі Мінскай гарадской СДЮШАР прафсаюзаў па мастацкай гімнастыцы імя Л.Г. Годзіевай нядаўна вярнуліся з Турына, дзе праходзіла першынство. Аляксандра Наркевіч заняла першае месца ў практыкаванні з абручом і другое месца ў камандных практыкаваннях, Зінаіда Луніна — другое месца ў групавых практыкаваннях, мнагабор'і, Ксенія Санковіч — таксама «серабро», але ў практыкаванні са скакалкай і Аліна Тумілоіч — трэцяе месца ў практыкаванні з булавамі і абручом. Юныя спартсменкі ў якасці падарунка атрымалі залатыя ўпрыгажэнні. «Поспеху дабіваюцца не самыя таленавітыя, а самыя цярплівыя. І акрамя гэтых падарункаў, мы падрыхтавалі вам сюрпрыз. Што гэта, вы даведаецеся непасрэдна перад адлётам у Пекін», — сказаў Леанід Козік.

Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, БЕЛТА.

Дарэчы, заўтра спаўняецца 60 гадоў Леаніду КОЗІКУ — старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, доктару эканамічных навук, заслужанаму работніку прамысловасці Беларусі. Віншуем!

ДАЕШ АЛЮМІНІЙ!

Дырэктар філіяла Пружанскага спажыўтаварыства заявіў у міліцыю, што з памяшкання цэха на вул. Лазо нехта выкраў 491 алюмінievую плітку. Неўзабаве было ўстаноўлена, што ў цэх ноччу залез 37-гадовы жыхар райцэнтра.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Змены ў ЦК БРСМ

Першым сакратаром Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі выбраны Юрый Крывадубскі. Кадравае пытанне было вынесена на парадак дня пленума ЦК БРСМ.

Юрый Крывадубскі раней працаваў намеснікам старшыні Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ. Леанід Кавалёў вызвалены ад пасады ў сувязі з пераходам на іншую працу. На пленуме таксама былі падведзены вынікі работы арганізацыі за мінулы год. У цяперашні час арганізацыя аб'ядноўвае больш за 490 тыс. маладых людзей.

Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.

Абзац

■ Сёння царква святкуе Памяць першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла. Падышоў да завяршэння Пятроўскі пост, на працягу якога хрысціяне рыхтаваліся да гэтага дня. 12 ліпеня — дзень, калі, згодна з паданнем, галоўныя хрысціянскія апосталы, «настаўнікі сярод настаўнікаў», Пётр і Павел, былі пакараныя смерцю ў Рыме. У народным календары лічыцца, што ад гэтага дня ідзе на схіл лета: «прыйшоў Пятрок — адшчыпнуў лісток...»

■ Крымінальная справа супраць цырульніка, які пакінуў без валасоў кліентку, узбуджана ў Гомелі. 16-гадовая дзяўчына звярнулася да прадпрымальніка, які працаваў дома, каб зрабіць меліраванне. У выніку яна атрымала апёкі і вымушаная была звярнуцца па дапамогу да медыкаў. Кліентка ўпершыню скарысталася такой паслугай. У выніку моцнай алергічнай рэакцыі дзяўчына згубіла валасы і прайшла курс рэабілітацыі. Ідзе расследаванне.

■ У КСУП «Палескі» Светлагорскага раёна падчас пажару знішчана 65 тон сена і 115 тон пашкоджана агнём. Прычыны ўзгарання высвятляюцца.

■ Амаль паўгектара пасеваў алейнага маку знішчылі памежнікі ў Іўеўскім раёне. Двума днямі раней лідскія памежнікі і супрацоўнікі міліцыі знішчылі 100 кг зялёнай масы маку на прысядзібным участку жыхара памежжа.

■ Учора раніцай у маскоўскай бальніцы памёр пісьменнік Анатоль Прыстаўкін — аўтар больш за 25 мастацкіх і дакументальных кніг. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

■ Усыноўленае ў Расіі дваццатадзюе дзіця памерла ў ЗША у аўтамабілі, які перагрэўся на сонцы. Там малога пакінуў прыёмны бацька. Машына прабыла на паркоўцы практычна цэлы дзень. Машына нагрэлася ад моцнай спёкі, і арганізм дваццатадзюе дзіцяці не вытрымаў. Па словах вучоных-метэаролагаў, тэмпература ўнутры аўтамабіля магла дасягнуць +54,4 °С. Бацька, якому 49 гадоў, у шокавым стане быў дастаўлены ў бальніцу. Яму пагражае да 10 гадоў пазбаўлення волі.

Поўны абзац

■ Канстытуцыйны суд Румыніі пастанавіў, што ўхвалены Сенатам закон, згодна з якім у СМІ павінна быць пароўну добрых і дрэнных навінаў, супярэчыць канстытуцыі. Законапраект быў практычна адзінадушна адобраны верхняй палатай румынскага парламента 26 чэрвеня г.г. Дэпутаты былі занепакоеныя негатыўным уплывам «дрэнных» навінаў на грамадскі клімат і самаадчуванне грамадзян. Прапанаваны закон, на думку сенатараў, павінен быў даць аўдыторыі магчымасць атрымліваць «разумова і эмацыйна ўраўнаважаны» малюнак дня. Рашэнне аб тым, якая навіна з'яўляецца негатыўнай, а якая — пазітыўнай, ускладвалася на Нацыянальны аўдыявізуальны Савет.

■ Пекінскім рэстаранам забаронена падаваць стравы з сабачага мяса падчас правядзення 29-х Алімпійскіх гульняў. 112 харчэўням кітайскай сталіцы, якія спецыялізуюцца на прыгатаванні сабачаціны, часова забаронена падаваць свае спецыяльныя стравы. Наведвальнікам, якія пажадаюць пакаштаваць такія стравы, будзе ветліва прапанавана заказаць нешта іншае. Абмежаванні не накладзеныя толькі на продаж мяса сабак у аптэках. У традыцыйнай кітайскай медыцыне лічыцца, што мяса «сябра чалавека» дапамагае тым, хто хварэе на гіпертанію.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серия БЛ № 0392113 *считать недействительным.*

Заўтра — Дзень работнікаў падатковых органаў

ТОЛЬКІ ДРУЖНА, ТОЛЬКІ РАЗАМ

спраўляюцца з усімі задачамі работніцы інспекцыі МПЗ Рэспублікі Беларусь па Савецкаму раёну горада Мінска Наталля ЛЕЦЯГА, Наталля КАЛУПАЕВА, Аліна ВІСКОВА, Ірына ДАМАРАЦКАЯ і Юлія БАБКОВА.

Справа ў кантакце

Камісія Міністэрства энергетыкі Беларусі завяршыла работу па расследаванні прычын аварыі на Лукомльскай ДРЭС (Віцебская вобласць).

Як паведамілі ў прэс-службе Мінэнерга, камісія прыйшла да высновы, што адключэнне ўсіх энергаблокаў на Лукомльскай ДРЭС было выклікана супадзеннем у часе шэрагу тэхнічных і рэжымных фактараў. Прычынай неспрацоўкі ўстройства рэзервавання псавання выключальніка стала адсутнасць кантакту, што было выклікана канструктыўнай недапрацоўкай пераключальнага ўстройства, у сувязі з чым ажыццявіць візуальны агляд яго стану пры ўключэнні было немагчыма. Па выніках работы камісіі міністэрствам прыняты неадкладныя меры і распрацаваны неабходныя мерапрыемствы па прадухіленні падобных сітуацый. У тым ліку гэтыя мерапрыемствы будуць накіраваны на ўдасканаленне абароны і абнаўленне абсталявання, узмацненне патрабаванняў да эксплуатацыйнага персаналу.

Наталля ВЯРБІЦКАЯ, БЕЛТА.

Зварот у карпункт

НЯЎЖО ПАРЭЧКА НЕ ПАТРЭБНАЯ?

У віцебскі карпункт «Звязды» звярнуўся жыхар Аршанскага раёна. І ўзняў актуальную, на яго погляд, праблему збыту ягад.

— Я — фермер і хачу звярнуцца да вас ад імя іншых знаёмых фермераў. Вось зараз шмат гавораць пра харчовую бяспеку. Ды і пра неабходнасць развіцця беларускіх перапрацоўчых прадпрыемстваў сказана нямала. Як і пра падтрымку прыватнага сельскагаспадарчага сектара. Хочацца расказаць пра наступную праблему — чаму мясцовыя кансервавыя прадпрыемствы так мала плацяць за здадзеныя ягады? Вось мы вырошчваем чорную парэчку. Аршанскае і віцебскае прадпрыемствы аб'явілі, што за кожны кілаграм тольki 1000 рублёў заплацяць. Такая цана была і летась. Ім жа яшчэ і прывесці трэба гэтыя ягады. Несур'ёзна. А гатовую перапрацаваную прадукцыю прадаюць па высокай цане. Аналагічная ў Расіі значна танней. Няўжо не разумеюць, што трэба ж, калі запросіш часовых рабочых, ім заплаціць. Няхай, напрыклад, за 4 вядры кілаграмаў па шэсць тысяч 20. І што, як гаспадару, мне застанецца пасля здачы, улічваючы транспартныя і іншыя выдаткі? Толькі некалькі тысяч! У Глыбокім, для параўнання, прапануюць за парэчку адносна больш. Але ж каб прывесці туды ягады, трэба пераадолець 220 кіламетраў. Можна і ў Барысаў, але ж гэта наогул у Мінскай вобласці. А вось у суседняй Расіі — у Смаленскай вобласці плацяць за беларускую парэчку і іншыя ягады добра. Ды і на рынках парэчка там каштуе, калі перавесці на нашы грошы, 20 тысяч за невялікае вядро, у нас на базары — 12—13 тысяч. Вось і возім за мяжу. Вымушаны проста паступаць «так не патрыятычна»...

І, сапраўды, няўжо мясцовыя перапрацоўшчыкі не зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з пастаўшчыкамі ягад? Чаму застаюцца ўбаку адказныя асобы? Не ўзнімаюць праблему, мо патрэбна падтрымка з Мінска? Гаспадары прыватных гаспадарак, дарэчы, здзіўляюцца, чаму, калі ўжо завяршаецца сезон, цана ўсё-такі павышаецца. Падлічылі, што прыкладна ў 2,5 раза? А яшчэ больш таму, што купляюць заводы тую ж ягаду ў Польшчы.

— Мы б таксама маглі, як палякі, замарожваць ягады, але адсутнічае халадзільная камера каштуе некалькі тысяч умоўных адзінак. Дзе ж іх узяць радавому фермеру? — канстатуе наш чытач. — Даўно трэба, каб недзяржаўныя структуры куплялі ў нас ягады. Вось была добрая ініцыятыва. Замежны бізнэсмен пажадаў укласці грошы ў кансервавую галіну. Прыехаў, доўгі час усё нешта абмяркоўваў з зацікаўленымі асобамі. У выніку вярнуўся ні з чым на сваю радзіму.

Наогул думаецца, што падтрымцы фермерскіх гаспадарак у нас яшчэ надаецца мала ўвагі. Пры гэтым тую ж знакавую для Беларусі культуру вырошчваюць у асноўным прыватнікі. А дзяржаўную фінансавую падтрымку на развіццё атрымаць цяжка. Пра гэта мы пісалі неаднаразова. А колькі дробных праблем даводзіцца вырашаць прыватнікам. Банальна, але, напрыклад, той жа гербіцыд. Вось была спецыялізаваная аграрная выстава ў Мінску, ды там, як адзначылі зацікаўленыя наведвальнікі, гербіцыд прапаноўвалі толькі ў вялікіх упакоўках. А калі прыватнай асобе трэба максімум 3 кілаграмы? Талакой купляць? Цана закупачная на малако і мяса перыядычна павышаецца. Не вельмі. Але трохі больш — усё роўна лепш чым нічога. А на ягады? Вядома, і на ягады неабходна. У іншым выпадку мы наогул можам застацца без парэчкі. А купляць у той жа Расіі — нашу!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ДА СТАБІЛЬНАЙ ЭКАНОМІКІ ТРЭБА ДАДАЦЬ ЯКАСЦЬ ПРАМЫСЛОВАЙ ПАЛІТЫКІ»

У канферэнц-зале рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя» (БНПА) прайшоў «круглы стол» з нагоды маючых адбыцца выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У сустрэчы ўзялі ўдзел члены БНПА і Савет дырэктараў гэтай арганізацыі. Яны яшчэ раз акрэслілі задачы сваёй дзейнасці на гэтым этапе і заклікалі ўсіх, хто заняты ў прамысловай сферы, адказна да іх паставіцца.

«Нам выпала жыць у эпоху глыбокіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, — гаворыцца ў дакументе. — Стаўшы суверэннай дзяржавай, фактычна з чыстага ліста будуючы знешнюю і ўнутраную палітыку, у пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя Беларусь аказалася перад рэальнай пагрозай страты эканамічнай незалежнасці.

Аднак дзякуючы ўзважанай сацыяльна-эканамічнай палітыцы была захавана і сёння якасна развіваецца прамысловасць, якая паэтапна выходзіць на новы тэхналагічны ўзровень, забяспечваючы канкурэнтаздольнасць айчыннай прадукцыі на ўнутраным і знешнім рынках. Рэалізуюцца буйныя інвестыцыйныя праекты з удзелам замежнага капіталу».

Валавы ўнутраны прадукт Беларусі няўхільна расце. Дынамічна развіваецца навука, ператварыўшыся ў рэальную прамысловую сілу. Трэба адзначыць, што ў мінулым годзе адбыўся першы з'езд навукоўцаў, які паказаў, што сувязь навукі і прамысловасці ўзмацняецца.

На аснове эфектыўнай эканомікі і моцнай сацыяльнай палітыкі ў Беларусі забяспечваюцца адны з самых высокіх сярод краін СНД даходы насельніцтва, узровень пенсійнага забеспячэння, удасканальваецца адрасная сацыяльная падтрымка. Вядома, усё гэта дасягнута самаадданай працай беларускага народа. Кіраўніцтва краіны цвёрда трымае курс на ўзмацненне дзяржаўнасці і развіцця эканомікі.

«Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя» — найстарэйшае ў краіне грамадскае аб'яднанне кіраўнікоў і вядучых спецыялістаў прадпрыемстваў і навукоўцаў, якая прадстаўляе інтарэсы вытворцаў, займаецца наладжваннем партнёрскіх сувязяў з іншымі краінамі, кланоцыцца аб эканамічнай стабільнасці дзяржавы, спрашчэнні заканадаўчай базы. Цяпер актыўна вядзецца супрацоўніцтва з Расіяй, Украінай, Казахстанам, з краінамі Еўрасаюза. У апошні час наладжаны сяброўскія адносіны з Кітаем. Усяго БНПА мае 54 грамадскія згуагненні, толькі 15 з якіх з беларускімі арганізацыямі.

— За апошнія два гады Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя і Рэспубліканскі савет дырэктараў, які ўзначальвае віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Сяргей Забалоцец, падрыхтавалі шэраг прапаноў і рэкамендацый. Яны ляглі ў аснову заканапраектаў, былі накіраваны ва Ўрад і іншыя найвышэйшыя інстанцыі. Асацыяцыя вывучае грамадскую думку і прапановы прамыслоўцаў, абагульняе іх, даводзіць іх да дзяржкіраўніцтва і імкнецца садзейнічаць іх выкананню, — адзначыў намеснік старшыні па правах і агульных пытаннях БНПА Віталь Саўрукевіч.

Ён дадаў, што выбары — важная грамадска-палітычная падзея ў жыцці краіны. Неабходна заахвоціць і падтрымаць тых кандыдатаў у дэпутаты, якія выступаюць за прагрэсіўныя тэндэнцыі развіцця краіны. Але на сёння існуюць некаторыя праблемы. Паводле слоў Уладзіміра Маркіна, саветніка па эканамічных пытаннях БНПА, многія дырэктары прадпрыемстваў праяўляюць слабую актыўнасць і зацікаўленасць. У мясцовых Саветах не хапае дэпутатаў, якія змаглі б узмацніць свой уплыў у рэгіёне, абараняць інтарэсы прамыслоўцаў, прыватных прадпрымальнікаў і, у рэшце рэшт, простых грамадзян.

Уладзімір Маркін у ходзе «круглага стала» акрэсліў шэраг заканадаўчых праблем. Гэта датычыцца ў першую чаргу падатковай сістэмы:

— Мы не кажам аб зніжэнні падатковай нагрузкі — толькі аб удасканаленні заканадаўчай базы. Трэба звярнуць увагу на змяншэнне колькасці дакументацыі. Вузкае кола спецыялістаў не дазваляе разабрацца ва ўсім гэтым!

Паводле слоў саветніка па эканамічных пытаннях БНПА, Беларусь павінна вывесці прамысловую палітыку на новы ўзровень, ушчыльную наблізіць да бізнэс-сферы. Калі з 1995 года назіраецца стабільнасць, то цяпер існуе праблема якасці прамысловай палітыкі.

Уладзіслаў КУЗЬМІН.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении открытого аукциона по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций Горецкого открытого акционерного общества «Типография БГСХА».

Аукцион состоится 9 сентября 2008 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Продавец — Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Для участия в аукционе в срок до 16.00 18 августа 2008 г. по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 предоставляются следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенная копия выданной Министерством финансов Республики Беларусь лицензии на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности на рынке ценных бумаг (профессиональными участниками рынка ценных бумаг);

представителями физических лиц — резидентов Республики Беларусь — нотариально заверенная доверенность;

юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не более, чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

представителями физических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность;

представителями юридических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность или иные легализованные в установленном порядке документы, подтверждающие полномочия представителя;

документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки, в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц представляют копию паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, и предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для заверения его копии лицом, принимающим документы.

Не допускается одновременное участие в аукционе заинтересованных лиц: физических лиц, состоящих в родственных отношениях или браке; юридических лиц, участниками которых выступают одни и те же физические и (или) юридические лица; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере двадцати и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

Для участия в аукционе уплачивается задаток в сумме 13 832 000 (тринадцать миллионов восемьсот тридцать две тысячи) белорусских рублей на счет № 3642974000028 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Задаток уплачивается в срок до 2 сентября 2008 г. согласно договору о задатке, заключаемому с Ф

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (28 чэрвеня). Па гарызанталі: Пятрушка. Набоб. Мара. Орда. Асёл. Шык. Кроп. Смык. Куб. Аніс. Папруга. Пай. Сена. Трал. Ясак. Салата. Трумо. Лаўсан. Арал. Ліпень. Кола. Яць. Тракай. Кафэ. Уладар. Муза. Абак. **Па вертыкалі:** Гандыкап. Астра. Помпа. Ара. Куля. Купа. Цыбуля. Смуга. Соль. Пена. Байка. Крама. Арол. Лепта. Дуб. Табар. Фраза. Дым. Рак. Бра. Альт. Указ. Стаўка. Шкіпер. Сок. Навала. Радыска. Вал. Наймічка.

Сканворд (2 ліпеня). Па гарызанталі: Леапард. Баланс. Разора. Тыгр. Коліка. Акбар. Картэж. Палісад. Кіраса. Рында. Сноў. Раманс. Маніла. Палова. Лір. Леў. Фасад. Радыска. Дар. Штандары. Кара. Бархан. «Аіда». Лектар. Рысь. Кандыдат. **Па вертыкалі:** Галкіпер. Атаман. Калым. Аколыш. Сын. Вестыбюль. Аэробіка. Стаўка. Кадр. Антракт. Дазатар. Хіт. Тын. Парадак. Рог. Нара. Бра. Ражка. Фры. Дача. Барс. Анфілада. Русо. Лідар. Аўтар. Рарытэт.

Сканворд (5 ліпеня). Па гарызанталі: Асацыяцыя. Возера. Сук. Дзяга. Траса. Раб. Міска. Казак. Мора. Брага. Дэпо. Под. Рака. Аркада. Кот. Дама. Латы. Трап. Ежа. Каруза. Жалеза. Анод. Мэта. Авал. Янот. Кава. Ядро. Аркан. Кама. Эра. Архімед. **Па вертыкалі:** Зародак. Жрэц. Кода. Гума. Ата. Жак. Мова. Аблава. Ток. Ева. Луза. Ярка. Слесар. Дуга. Аладка. Русак. Рама. Акаба. Пазыка. Гонар. Збор. Цар. Катран. Капа. Руно. Год. Азот. Вадаспад. Фіёрд.

Выпрабавана на сабе

Сезон «КВАСіць»

Летам без вады, соку, ліманаду, кампоту ці гарбаты нікуды — хочацца піць. Менавіта ў гэту пару года асаблівай папулярнасцю карыстаецца квас. І нядзіўна, бо гэта адзін з найлепшых славянскіх безалкагольных напояў. З даўніх часоў квас быў пастаянным атрыбутам на стале нашых продкаў незалежна ад іх сацыяльнага становішча. Гэту любоў можна лёгка патлумачыць. Па-першае, квас нармалізуе абменныя працэсы ў арганізме, па-другое, павышае апетыт і праганяе смагу, па-трэцяе, валодае высокай энергетычнай каштоўнасцю і павышае працаздольнасць.

Для таго, каб прапусціць праз сябе «квасныя» праблемы, вырашыла хоць дзень папрацаваць прадаўцом квасу. Але не ўсё так проста: аказваецца, каб прадаваць людзям квас, трэба абавязкова мець на руках медыцынскую кніжку, якой у мяне, на жаль, няма. Таму мне дазволілі толькі пастаяць побач з прадаўцом — прайсці, калі можна так сказаць, тэарэтычную стажыроўку. Дарэчы, падобнае выпрабаванне чакае кожнага патэнцыяльнага работніка, які, у адрозненне ад мяне, мае на руках медыцынскую кніжку (гэта дае магчымасць яшчэ і папрактыкавацца пад кантролем вопытнага прадаўца).

Спачатку людзі падыходзілі па адным з інтэрвалам у 10—15 хвілін. Алена Раманаўна (прадавец квасу) прачытала ў маіх вачах разгубленасць («А дзе тыя чэргі за квасам, якімі так не задаволены людзі?»)

— На аўтобусных прыпынках чэргі — раскоша, асабліва ў такі ранні час, — з усмешкай гаворыць яна. — Вось, калі я працавала на Чэрвеньскім рынку... За спякотны дзень магла прадаць аж 480 літраў квасу. Ад людзей адбою не было. За гэты ж сезон мой дзённы рэкорд пакуль што — 250 літраў.

Алена Рыгораўна расказала, што прадаўцом квасу падпрацоўвае ўжо пяты сезон (сезон пачынаецца, калі пачынае цяплець, звычайна ў маі, і заканчваецца ў верасні, пік прыходзіцца на тры летнія месяцы).

— Я адна гадую дачку, таму даводзіцца круціцца, як вавёрка ў коле. Часта падпрацоўваю, ніякай працы не цураюся.

Дарэчы, сёлета дачка Алены Раманаўны таксама вырашыла папоўніць сямейны бюджэт: на вакацыях прадае квас на пару з маці.

Час блізіўся да абеду. Сонца пачало прыпякаць мацней. На нашу радасць, людзі пачалі падцягвацца...

У ДЗЯЦІНСТВЕ І СОЛЬ САЛОДКАЯ

Заўважыла, што людзі ва ўзросце з асцярогай ставяцца да новага агрэгата — кега (кег — металічная ёмістасць, якая выкарыстоўваецца для захоўвання і транспарціроўкі піва і іншых алкагольных ці безалкагольных напояў пад ціскам.)

— Дачушка, а дзе можна знайсці бочкавы квас? — пытаецца дзядуля ў вялікіх з тоўстым шклом акулярах, змахваючы рукой кропелькі поту з ілба. — З бочкі квас смачнейшы. Праўда, і ён ні ў якое параўнанне не ідзе з квасам маёй маладосці (*уздыхае*). Не ведаю, з чым гэта звязана, мо яго па-іншаму сталі рабіць?..

Пытанне дзядулі, які перажывае настальгію па квасу савецкіх часоў, я адрасавала **дырэктару па вытворчасці ААТ «Лідскае піва» Святлане ЗУБКО.**

— Тэхналогіі вытворчасці квасу з савецкіх часоў не мяняліся. Проста зараз у пакупніка з'явіўся выбар: ён можа набыць квас як на разліў (з кегаў і бочак), так і ў бутэльках. Вытворцу любімага напою таксама можна выбраць, бо квас розных вытворцаў мае свае смакавыя асаблівасці. Таксама смак квасу напрамую залежыць ад якасці яго разліву (калі дрэнна памыць кег ці бочку, квас бродзіць, робіцца кіслым). Ці, што недапушчальна, нядобрасумленны прадавец разбавіць квас вадой, каб зарабіць больш грошай. Але, згадзіцеся, незадаволеныя смакам квасу ў асноўным пажылыя людзі. Часта можна пачуць ад бацькоў, што «раней і марожанае было смачнейшым і гарбуз быў больш сакавітым». Дзяцінства ёсць дзяцінства, там ўсё выглядае ў яркіх фарбах. А з узростам людзі, на жаль, сустракаюць здольнасць радавацца дробязям.

ДОБРЫ КВАС ЗАЎСЁДЫ З ПЕНАЙ

Падыходзілі па квас розныя людзі. Адны набывалі квас толькі таму, што душна і менавіта кег з квасам трапляўся на вочы ў гэты момант («Каб тут стаяў іншы халодны напой, купіў бы яго»). Але большасць кліентаў усё ж такі аматары квасу — п'юць яго амаль штодзень («Пасля кубачка квасу не так піць хочацца, чаго не скажаш пра газіраваныя напоі», «перад выхаднымі набываю пяць літраў квасу, бяру з сабой на лецішча», «у дзяцінстве каля майго дома стаяла жоўтая бочка, таму бацька кожны дзень адпраўляў мяне па новую бутэльку хлебнага напою»).

Яшчэ раз пераканалася, што праца з людзьмі патрабуе шмат сілаў, бо не ўсе кліенты ветлівыя і шчаслівыя, шмат трапляецца незадаволеных і нават азлобленых людзей.

— Колькі можна чакаць (хоць прадавец не ў сілах зрабіць так, каб квас цёк хутчэй), — незадаволена бурчыць мужчына ў спартыўных штанах і з голым торсам.

— Я хачу, каб квас быў без пены, — загадвае жанчына з вядром чарніц у руках.

— Добры квас заўсёды з пенай, — спакойна адказвае Алена Раманаўна. — Калі без пены, значыць, не свежы.

— Напэўна, вы шмат зарабляеце. Не тое, што мы, урачы, — папракае прахожы.

Алена Раманаўна толькі ўсміхаецца. А я дзіўлюся, як у яе атрымліваецца стрымацца і не сказаць што-небудзь крыўднае ў адказ.

— Я ў гандлі ўжо больш за 20 гадоў працую, — зноў чытае мае думкі жанчына. — З людзьмі праблем няма. Проста не звяртаю ўвагі на крыўдныя словы ў свой адрас, пакупнікі розныя бываюць.

І прадаўцы таксама, падумала я.

Аб тым, якія патрабаванні прад'яўляюцца да прадаўцоў квасу **расказала ўрач-гігіеніст аддзялення гігіены харчавання Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Маскоўскага раёна горада Мінска Ларыса КАРАНЕВІЧ:**

— Згодна з санітарнымі правіламі прадавец квасу ў абавязковым парадку павінен мець пры сабе медыцынскую кніжку. Акрамя таго, яму неабходна прайсці курс гігіенічнага абучэння (сюды адносяцца ўсе правілы асабістай гігіены). Непазадаволена адазваўся ён і пайшоў дадому без квасу.

З гэтай праблемай я звярнулася да **інспектара-метадыста Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Святланы ФІЛІПЕНІ:**

— Сёлета людзі незадаволеныя тым, што ў адных раёнах горада дазваляюць прыносіць свае бутэлькі пад квас, у іншых не. Акрамя таго, некаторыя прадаўцы, наліваючы квас у прынесеную бутэльку, бяруць грошы і за гэту бутэльку. А ў Заводскім раёне, акрамя таго, каб кампенсаваць кошт бутэлькі, даюць аднаразовыя кубкі ў прыдачу. Спажыўцы незадаволены. Што датычыцца пустых аднаразовых кубкаў, то пакупнік мае поўнае права адмовіцца ад непатрэбнага тавару. А вось што рабіць са сваёй тарай, ці можна наліваць квас у бутэлькі, якія прыносяць людзі (няўзброеным жа вокам нябачна, чыстая бутэлька ці не, а мікраскопам ніхто не будзе (раскіданыя аднаразовыя бутэлькі, смецце вакол бочкі). За санітарны стан прылеглай тэрыторыі нясе адказнасць непасрэдна прадавец. Побач павінна быць усталявана сметніца ці аднаразовы пакет, куды кожны можа выкінуць кубачак, пасля таго, як выпэ кваc.

АДНАРАЗОВАЯ БУТЭЛЬКА, ТАМУ І АДНАРАЗОВАЯ

Вось на гарызонце і новыя пакупнікі.

— Навошта табе гэты квас, дадому прыйдзем, вады пап'еш, — адгаворвае жонку ад пакупкі мужскнара.

— Я піць хачу. Табе што, 370 рублёў шкада, — ледзь не плача жанчына.

Падышлі. Выпілі адзін кубачак на дваіх. Мужчына вымае з торбы пластыкавую бутэльку.

— Наліце яшчэ з сабой.

— Нам нельга наліваць квас у вашы бутэлькі. У нас ёсць свая тара, чыстая. Яна каштуе 310 рублёў.

— А вам абы грошы здзіраць, — дзець мікробы)? Таму мы напісалі ліст у гарадскі Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі з просьбай, каб яны дакладна вызначылі, як з гэтым быць.

Вось што сказалі наконт гэтага ў **Мінскім гарадскім Цэнтры гігіены і эпідэміялогіі:**

— У санітарных патрабаваннях прапісана, што аднаразовы посуд не павінен выкарыстоўвацца двойчы, — адзначыла **ўрач-гігіеніст аддзялення гігіены і харчавання Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Таццяна АНЦІЛЕЎСКАЯ.** — Таму наліваць квас у прынесеныя бутэлькі, якія пакупнікі прыносяць з сабой, адназначна нельга. Любая тара павінна праходзіць першапачатковую апрацоўку. Людзі павінны разумець, што проста памыць, гэта не значыць прадэзінфіцыраваць. Мікробы застаюцца. Вось і атрымліваецца, што спачатку п'юць з брудных бутэлек, а трапіўшы ў бальніцу, скажуць, што квас быў дрэнны...

...За дзень працы прадаўцом квасу разбалелася галава — ці то ад спякоты, ці то ад вялікай колькасці інфармацыі. Бо многія людзі прыходзяць не столькі па квас, колькі выгаварыцца. Ніколі не забудуся маршчыністы твар ужо немаладой жанчыны, якая пакуль піла квас, паспела расказаць гісторыю свайго жыцця:

— Лепш бы квас пілі, чым гарэлку (уздыхае)... Я ж урач. П'яніцы да мяне прыходзяць. Сэрца ў іх ужо і сэрцам складана назваць, праспіртаванае ўсё. У мяне ж дачка выпіваць пачала, як на рынак уладкавалася працаваць. Унук таксама не падарунак, з 12 гадоў, гледзячы на маці, стаў півам сябе песціць, выпівае і больш моцныя напоі. А цяпер яны мяне выганяюць з маёй жа кватэры...

...

Каментарый **начальніка ўпраўлення каардынацыі і развіцця галін па вытворчасці прадуктаў харчавання і тытунёвых вырабаў канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Генадзя БОГДАНА:**

— Вытворчасць квасу ў рэспубліцы ажыццяўляюць у асноўным такія буйныя піваварныя арганізацыі, як «Брэсцкае піва», «Крыніца» і «Лідскае піва». Доля гэтых прадпрыемстваў у агульным аб'ёме вытворчасці квасу складае 5,7, 15,2 і 63,5 працэнта адпаведна.

Сёння ў нашай краіне назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да павышэння культуры як вытворчасці, так і спажывання нацыянальнага славянскага напою. Так, многія прадпрыемствы пачалі адмаўляцца ад разліву квасу ў бочкі, якія не могуць у поўнай меры забяспечыць захаванасць якасці прадукту. На мой погляд, будучае за кегамі. Рэалізацыя і, адпаведна, вытворчасць квасу, у першую чаргу, залежыць ад надвор'я. Напрыклад, на «Крыніцы» за чэрвень гэтага года рэалізавана 158 тысяч дал квасу, у тым ліку бочкавага — 88 тысяч дал (за май — 44 тысячы дал, у тым ліку бочкавага — 15 тысяч дал). Для павелічэння аб'ёмаў рэалізацыі піва і кегавага квасу ў ліпені прадпрыемства набывае 7 тысяч кегаў (зараз «Крыніцы» належыць 13 тысяч кегаў), палова з якіх у сезон спажывання будзе накіравана на рэалізацыю квасу.

Прадпрыемствы нашай краіны задавальняюць попыт спажыўцоў на квас на працягу ўсяго года, нягледзячы на тое, што гэты прадукт з'яўляецца сезонным. Акрамя таго, сёлета філіял «Гомельскага лікёра-рэлачнага завода» «Палессе» ажыццяўляе вытворчасць канцэнтрату кваснага сусла ў ПЭТ-бутэльках. Такім чынам, кожны ахвотнік можа прыгатаваць квас у хатніх умовах.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Класічныя жоўтыя бочкі прыйшлі да нас з савецкіх часоў. Некаторыя баяцца набываць з іх квас, аргументуючы гэта старасцю ёмістасці.

— Стэрыльнасць кожнай бочкі гарантавана, супакойвае ўрач-гігіеніст аддзялення гігіены харчавання Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Маскоўскага раёна горада Мінска Ларыса Караневіч. — Перад тым, як напоўніць бочку квасам, кожная праходзіць спецыяльную апрацоўку.

ЯК ПРЫГАТАВАЦЬ КВАС У ХАТНІХ УМОВАХ?

Сёння вядома мноства спосабаў прыгатавання гэтага дзівапитва, але традыцыйным лічыцца рэцэпт сухарнага квасу:

1. Жытнія сухары (1 кілаграм) абсмажваюць у духоўцы да залацістай скарынкі. Складаюць у каструлю, заліваюць цёплай вадой і пакідаюць у цёплым месцы на пару гадзін, перыядычна памешваючы.

2. Настой зліваюць. Сухары, якія засталіся, яшчэ раз заліваюць вадой, настойваюць 1—2 гадзіны і новы настой зліваюць у настой, які быў атрыманы раней.

3. Атрыманае сусла (можна набыць гатовае) ахалоджваюць да дваццаці градусаў.

4. Дадаюць цукар (на тры літры вады — 1,5 шклянкі цукру) і дрожджы (40 грамаў), якія папярэдне трэба развесці гэтым жа суслам.

5. Пакідаюць у цеплыні на 12 гадзін.

6. Гатовы квас разліваюць у бутэлькі і захоўваюць у халаднаватым месцы

ЧАЛАВЕК, ЯКІ БЫЎ ЗА КАДРАМ

Але кінакадры, якія ён зняў, увайшлі ў скарбонку лепшых фільмаў Беларусі. Жыве і памяць пра аператара і рэжысёра Юрыя Марухіна, які пайшоў ад нас заўчасна. 13 ліпеня яму споўнілася б 70 гадоў.

Больш за 37 гадоў свайго жыцця ён аддаў «Беларусьфільму» і ўвогуле беларускаму кіно, хоць сам нарадзіўся на Тамбоўшчыне. Але Марухін, атрымаўшы адукацыю ва Усесаюзным дзяржаўным інстытуце кінематаграфіі як аператар, прыехаўшы працаваць у Мінск, стаў здымаць сапраўднае нацыянальнае кіно — ці то сучаснае, ці то тое, якое звярталася да часоў сівой даўніны. Як аператар ён працаваў над шматсерыйным фільмам «Час абраў нас», але і адчуваў дух старажытнай Беларусі, які тонка перадала яго камера ў фільме «Магіла льва», аснову для якога далі легенды. І нават калі ён стаў сам здымаць як рэжысёр, то звяртаўся часта да беларускага матэрыялу — варта ўзгадаць яго фільм «Радуніца». Так з'явіўся і фільм «Маці Ўрагану» паводле Кастуся Кастэвіча. Дарэчы, Юрый Марухін захапляўся творчасцю гэтага пісьменніка. Нездарма яго працу ацанілі нават у Галівудзе, адкуль Юрый Марухін атрымаў прапановы аб супрацоўніцтве. Але найперш ён стаў асобай беларускага кіно, якую добра ведалі ў любой кропцы СССР. Аператарскае майстэрства Марухіна застаецца прыкладам для сённяшніх творцаў, ён быў добрым настаўнікам для аператараў, якія працягваюць паспхова працаваць у кіно.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПРЫРОДНАЯ АПТЭКА

Магутныя памочнікі

Дрэвы — вялікія лекары, і калі б у іх была такая магчымасць, то яны адкрылі б вялізную аптэку, у якой можна было б знайсці лекі ад самых розных хваробаў. Давайце прыгадаем хоць бы малую крыху тых магчымасцяў, якія могуць даць нам нашы магутныя памочнікі.

Бяроза — традыцыйны мачагонны сродак. Для дасягнення мачагоннага эфекту вазьміце 1 ст. лыжку здробненага лісця ці пупышак бярозы, заліце 0,5 л кіпеню, дайце гадзіну настояцца. Працадзіце, піце па 0,5 шклянкі 4 разы на дзень за 20—30 хвілін да яды.

Пры страўнікава-кішачных крывацёках і паносах выкарыстоўваюць адвар кары **дуба**. 2 ст. лыжкі здробненай кары заліце 1 шклянкай гатаванай вады, накрыйце накрыўкай, трымайце на вадзяной лазні 30 хвілін, затым астудзіце, даліце да першапачатковага аб'ёму, працадзіце. Піце па паўшклянкі 3 разы на дзень. Гэты ж адвар можна скарыстаць для паласкання пры фарынгітах, танзілітах і стаматытах.

Для лячэння артрыту вазьміце 3 ст. лыжкі кары **чаромхі**, заліце шклянкай гарэлкі, дайце настояцца два тыдні. Уцірайце ў хворыя суставы 2 разы на дзень.

Для інгаляцый пры запаленнях горла і бронхаў прыгатуйце адвар з **эўкаліптавага** лісця. 10 г лісця пракіпяціце 10—15 хвілін у шклянцы вады, працадзіце. Гарачым адварам рабіце інгаляцыі, а калі вы яго астудзіце да пакаёвай тэмпературы, то можна прымаць і ўнутр па 1 ст. лыжцы 3—4 разы на дзень як адхарквальны і процізапаленчы сродак.

Сасновыя пупышкі валодаюць дэзінфекцыйным, процізапаленчым і мачагонным дзеяннем. Зрабіце настой пупышак, заліўшы чайную лыжку сыравіны шклянкай вады, прымайце па 1 ст. лыжцы 3—4 разы на дзень.

Для лячэння варыкознага расшырэння венаў і гемарою вазьміце 50 г кветак конскага **каштана**, заліце 0,5 л 50-працэнтнай гарэлкі, дайце настаяцца 1—2 тыдні. Прымайце настойку па 30—40 кропель 3—4 разы на дзень на працягу 3—4 тыдняў. Гэту настойку можна прымяняць і для вонкавых кампрэсаў.

ХАТНІЯ НАРЫХТОЎКІ

Ягады ва ўласным соку з цукрам

Вішні. *1 кг вішань, 1 кг цукру.*

Вішні прамыйце, выдаліце костачкі, перасыпце цукрам, пакіньце на 8—12 гадзін. Затым пастаўце тазік на невялікі агонь, масу паступова давядзіце да кіпення, адразу разліце ў гарачыя стэрылізаваныя слоікі, закатайце, перавярніце накрыўкамі ўніз, зверху накрыйце ручніком і пакіньце да астывання.

Маліны. *3 кг малін, 750 г дробнага цукру ці цукровай пудры.*

